ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 28 (664) | Аўторак, 20 кастрычніка 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ВЯЛІКІ КАСТРЫЧНІК І СУЧАСНЫ РАБОЧЫ КЛАС

Так называлася навукова-практычная канферэнцыя, якая адбылася на пятым курсе эканамічнага факультэта спецыяльнасці АМАЭІ. Канферэнцыя была падрыхтавана пры ўдзеле дацэнта А. П. Касьяненкі і асістэнта кафедры навуковага камунізму В. В. Юферава.

Вялікую ўвагу і цікавасць выклікалі даклады Л. Карпенка «НТР і рабочы клас», А. Іваноўскай і Н. Меншаковай — «НТР: стратэгія капіталу — выклік рабочаму класу», А. Баравік — «Маргеналы і грамадства», Н. Міхальчанка — «Рабочы клас — перадавая сіла грамадскага развіцця краін Азіі і Афрыкі», А. Землякова — «Аб ролі рабочага класа ў сучаснай Польшчы», Т. Кавалёвай — «Рабочы клас у ядзерны век».

Адбылося шырокае абмеркаванне заслуханых дакладаў.

**Л. КІР'ЯНАВА,**
**студэнтка 5-га курса эканамічнага факультэта, удзельніца канферэнцыі.**

**Работнікі вышэйшай і сярэдняй школы! Паслядоўна ажыццяўляйце перабудову адукацыі! Умацоўвайце сувязь вучобы з жыццём, змагайцеся за трывалыя веды навучэнцаў і студэнтаў!**

(З Заклікаў ЦК КПСС да 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).

# ІНІЦЫЯТЫВА БЕЗ ІНСТРУКЦЫЙ

## ПАТРЭБНА СЁННЯ ВНУ КРАІНЫ

У вышэйшай школе ідзе перабудова. Яе напрамкі прадвызначаны рашэннямі партыі і ўрада. Адбылася змена прыярытэтаў. Прызнаны немэтазгодным валавы падыход да падрыхтоўкі спецыялістаў. Пастаўлена задача рэзка павысіць якасць ведаў і творчы патэнцыял выпускнікоў вышэйшай школы.

У ВНУ працягваецца працэс вывучэння, асваення, асэнсавання ідэй і дакументаў перабудовы. Пачаліся першыя спробы і эксперыменты. Аднак энтузіястаў і наватараў пакуль яшчэ значна менш, чым тых, хто адносіцца да перамен не толькі з чаканнем, але і насцярожана. Практычнае ж ажыццяўленне ідэй перабудовы не зрушылася далей самых першых крокаў у адносна невялікай колькасці ВНУ.

Галоўным стрымліваючым фактарам стала прывычка, якая глыбока ўкаранілася, — дзейнічаць толькі па інструкцыі. Разумеючы неабходнасць перамен, многія разлічваюць на ініцыятывы «зверху», гэта значыць чакаюць добрых указанняў замест «дрэнных». Але нават самая дзелавая інструкцыя лепш працуе пры падтрымцы разумнага сэнсу, творчага падыходу да справы, ініцыятывы.

Нам вельмі перашкаджае закаранелая прывычка карыстацца ў кіраванні нават такой творчай і дэмакратычнай сістэмай, як вышэйшая школа, прынцыпамі жорсткай заарганізаванасці. Толькі рашучае адмаўленне ад яе дазволіць стварыць новы тып вышэйшай навучальнай установы, дзе пануюць кампетэнтнасць, дух пошуку, дзе заахвочваюць дыскусіі, а не заспакоенасць. Усім нам — работнікам ВНУ і міністэрстваў — трэба зрабіць рашучыя крокі ў развіцці дэмакратычных традыцый вышэйшай школы, узнавіць культ ведаў, прэстыж чэснай, якаснай працы, павагу да творчага чалавека. Бяздушша, пратэкцыянізм, аўтарытарны стыль упраўлення, навучання і выхавання — не толькі галоўныя ворагі станаўлення спецыяліста, яны зневажаюць чалавека, перашкаджаюць рэалізаваць яго прызванне і магчымасці.

Вось чаму галоўнае цяпер — разняволіць асобу выкладчыка, даць магчымасць кожнаму выявіць творчы бок сваёй індывідуальнасці, на справе разбудзіць асабістую зацікаўленасць.

Для таго, каб справы пайшлі добра, трэба абыходзіцца з людзьмі дастойна, ствараць атмасферу заахвочвання іх поспехаў. Адкуль узялося недарэчнае перакананне, што любы кантралёр, работнік міністэрства або НДІВШ, які гадамі ці ніколі ў жыцці не бачыў студэнта, лепш ведае, як яго вучыць, чым педагог, што працуе ў ВНУ ўсё сваё жыццё? Усім нам прадстаіць раз і назаўсёды зразумець і прыняць як кіраўніцтва да дзеяння: лепш ведае справу той, хто гэту справу робіць.

Дабіцца рэальнага павышэння якасці ведаў выпускнікоў ВНУ — значыць рашуча адмовіцца ад дыктата асабістых сувязей і інтарэсаў, безадказнай паблажлівасці. Здараюцца яшчэ сітуацыі, калі гультая і нахабніка трымаюць у ліку студэнтаў з-за свядомага або бессвядомага жадання стварыць бачнасць фармальнага дабрабыту. Але адзін толькі такі «жывы прыклад» зводзіць на нішто ўсе нашы шматлікія выхаваўчыя мерапрыемствы, плодзіць рады прагматыкаў і спрытнюг — і не дзе-небудзь, а сярод моладзі. Ды і сярод выкладчыкаў мы часам церпім гультаёў, халтуршчыкаў, ананімшчыкаў, якія наносяць вялікую шкоду выхаванню моладзі.

Механізм ажыццяўлення жорсткасці і патрабавальнасці да высокіх прафесіянальных і маральных якасцей выкладчыкаў і студэнтаў створаны. Гэта атэстацыя і адкрыты конкурс (кожныя пяць гадоў) замест зжыўшага сябе перавыбрання. На іх будзе ўлічвацца штогадовая анкетная ацэнка студэнтамі якасці працы выкладчыкаў. Адменены нарэшце ўмоўны перавод студэнтаў з курса на курс, разарвана сувязь паміж колькасцю адлічаных студэнтаў і колькасцю выкладчыкаў.

Каб такі механізм стаў чотка і эфектыўна працаваць у напрамку фарміравання сапраўдных каштоўнасцей, нам прадстаіць адпрацаваць сістэму матэрыяльнага і маральнага ўздзеяння на чалавека. Настаў час канчаць з практыкай абязлічаных заахвочванняў па святочных днях. Пахвала, падтрымка павінны стаць канкрэтнымі: на радавой дзелавой нарадзе — за новую методыку, новую задачу ў лабараторным практыкуме, вышэйшы бал пры анкетаванні студэнтаў. Такой падзякі і цана іншая, чым атрыманай «па спісу».

Важнейшая задача — перагледзець змест адукацыі: рабочых планаў і праграм, выдзеліць галоўнае, тое, што фарміруе спецыяліста данага профілю. Работа ідзе марудна. У многіх выкладчыкаў сфарміраваўся стэрэатып мыслення аб перабольшанай значнасці сваёй дысцыпліны. Цяжкая, канешне, справа — перабудоўваць псіхалогію «прадметнікаў», але інакш не дабіцца гармоніі ў навучанні.

Важнейшай умовай павышэння якасці падрыхтоўкі становіцца павелічэнне долі самастойнай работы студэнтаў шляхам скарачэння абавязковых аўдыторных заняткаў. Не сакрэт, што гэта патрабаванне падтрымліваюць далёка не ўсе выкладчыкі. Іх палохае, як ім здаецца, аслабленне кантролю за падапечнымі.

Што тут, на маю думку, важна? Выкладчык павінен уважліва сачыць за выкананнем індывідуальных самастойных заданняў у ходзе абавязковых субяседаванняў са студэнтам адзін на адзін або з групай у 3—4 чалавекі. Але толькі не ў форме апытання, а як размова калег. Глыбокае веданне прадмета, такт і павага да студэнта могуць забяспечыць тут поспех. Такія гутаркі выконваюць і функцыі кантролю, але кантролю развіваючага і ўзбагачаючага.

Для самастойнай работы студэнтаў абавязкова патрэбны добрыя падручнікі. Сітуацыя тут далёкая ад паспяховай. І не толькі таму, што падручнікаў часам не хапае ўсім студэнтам. Большасць з іх не адпавядае сучасным патрабаванням.

Нашы падручнікі носяць «манаграфічны» характар, іх аўтары спрабуюць у абмежаваным аб'ёме даць як мага больш звестак з данай галіны навукі, вызначыцца эрудыцыяй. У выніку такая кніга не вучыць, а выкладае. Часам незразумела і недакладна. Часам з памылкамі. А галоўнае, у падручніку адсутнічаюць кантрольныя заданні і практыкаванні. Таму студэнт не можа праверыць, ці правільна ён усё зразумеў, ці зможа прымяніць прачытанае для рашэння задач. А механічнае запамінанне — вораг прафесіянальнага мыслення

Патрабуе сур'ёзных змен існуючая сістэма кантролю вучобы студэнта. Яна па сутнасці сваёй фармальная, а значыць выклікае імкненне даваць справаздачу фармальна.

У некаторых ВНУ выкладчыкі-энтузіясты адмовіліся ад традыцыйнай формы экзаменаў, калі студэнт пераказвае выкладчыку змест падручніка або лекцый. Яны прапаноўваюць заданні, выкананне якіх патрабуе трывалага ведання фундаментальных законаў і ўмен-

(Заканчэнне на 2-й стар.)

**Учора ў сталіцы нашай краіны — Маскве ў Вялікім Крамлёўскім палацы пачала сваю работу восьмая сесія Вярхоўнага Савета СССР адзінаццатага склікання. Абмеркаваныя на ёй пытанні і прынятыя пастановы паслужаць справе далейшага сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай сацыялістычнай дзяржавы, ажыццяўляемай перабудовы.**

*Алімпіяда «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс»*

# ПОСПЕХ БЕЛАРУСКАЙ КАМАНДЫ

У г. Маскве нядаўна праведзены Усесаюзны этап алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» па праграміраванню. Маскоўскі эканоміка-статыстычны інстытут зрабіў усё для таго, каб турнір прайшоў паспяхова: выдзеліў неабходную вылічальную тэхніку, арганізаваў цікавую культурную праграму.

Удзельнікамі алімпіяды сталі зборныя каманды 14 саюзных рэспублік і гарадоў Масквы і Ленінграда (у кожнай камандзе па тры чалавекі). Арганізатары разбілі турнір на тры туры, прапанавалі напісаць і адладзіць праграмы на адной з алгарытмічных моў высокага ўзроўню, на мове нізкага ўзроўню (асемблер ОС ЕС) і на мове Бейсік для персанальных камп'ютэраў.

З задавальненнем можна адзначыць, што першае каманднае месца заваявала зборная каманда БССР пад кіраўніцтвам дацэнта БДУ імя У. І. Леніна В. М. Котава. У яе саставе выступалі студэнты факультэта прыкладной матэматыкі Белдзяржуніверсітэта Д. Дварцовай, І. Волкаў і чацвёртакурснік матфака нашага універсітэта В. Ляўчук. У асабістым заліку яны занялі адпаведна першае, шостае і дзявятае месцы.

Аб карыснасці такіх турніраў гаворыць наступны факт: летам бягучага года на адным з вылічальных цэнтраў сталіцы нашай Радзімы працаваў першы Усесаюзны студэнцкі атрад праграмістаў. Цяпер заключаецца дагавор з буйнейшым прапрыемствам краіны КамАЗам, які набыў амерыканскія камп'ютэры, дзе ўдзельнікі алімпіяд змогуць рэалізаваць свае веды і вопыт. Застаецца дадаць, што для ўдзелу ва Усесаюзнай алімпіядзе неабходна заваяваць прызавое месца на рэспубліканскім туры, які адбудзецца ў красавіку наступнага года. Таму ўжо зараз трэба пачынаць падрыхтоўку да яго.

**А. КАМОРНІКАЎ,**
**нам. дэкана матэматычнага факультэта па навуковай рабоце.**

*Творчай моладзі — ініцыятыву і пошук*

# АДКАЗВАЦЬ СПРАВАЙ

**У выступленні на XX з'ездзе ВЛКСМ Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў гаварыў аб вялікіх задачах у справе перабудовы, якія стаяць перад савецкай моладдзю ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Гэта ў поўнай меры адносіцца і да маладых вучоных. Больш трэцяй часткі выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў нашага універсітэта — моладзь. Факт гэты сведчыць аб важнай ролі, якую павінен адыгрываць выразнік інтарэсаў і арганізатар грамадскага і навуковага жыцця маладых вучоных — Савет маладых вучоных і спецыялістаў ГДУ.**

**У апошнія гады дзейнасць Савета ішла па шляху паступовага затухання, і гаварыць цяпер пра само яго існаванне — значыць праявіць неапраўданы аптымізм.**

**Становішча, якое склалася, ставіць рад неадкладных задач. Неабходна ўзнавіць Савет, а таксама здольныя эфектыўна функцыяніраваць яго структуры на ўсіх факультэтах універсітэта. Савет маладых вучоных — адна з грамадскіх арганізацый. Відавочна, у сваёй рабоце ён павінен асноўную ўвагу ўдзяліць менавіта навуковаму жыццю моладзі універсітэта. Добрым сродкам стымулявання навуковай актыўнасці маладых вучоных з'яўляецца правядзенне конкурсаў навуковых работ на ўсіх узроўнях — ад універсітэцкага да ўсесаюзнага. Важным станоўчым аспектам такіх конкурсаў з'яўляецца тое, што навуковая работа кожнага ўдзельніка канкурыруе з працамі такіх жа маладых вучоных, як і ён сам, не зведвае, як кажуць, націск аўтарытэтаў. Дзейнасць Савета будзе ўключаць таксама такія формы як навукова-адукацыйная работа са школьнікамі, удзел маладых вучоных у рабоце навуковых семінараў, гурткоў, у канферэнцыях і сімпозіумах і інш. Мы будзем рады вітаць любую ініцыятыву, здольную ўзбагаціць навуковае жыццё універсітэта, зрабіць яго больш цікавым.**

**А. СІДАРАЎ,**
**старшыня Савета маладых вучоных і спецыялістаў ГДУ, асістэнт кафедры алгебры і геаметрыі.**

*Правяраюць народныя кантралёры*

# ЧАС НЕ ЧАКАЕ...

У пастанове ЦК КПСС «Аб ходзе падрыхтоўкі народнай гаспадаркі да работы ў зімовых умовах» адзначаецца, што ўзровень арганізацыі і якасць выкананых работ выклікаюць сур'ёзную заклапочанасць. У радзе ведамстваў і на месцах нярэдка ацэньваюць падрыхтоўку да зімы па сярэдніх паказчыках, што стварае ўпрыгожаную карціну дабрабыту.

Праверка, праведзеная камісіямі галаўной групы і груп народнага кантролю факультэтаў 15—30 верасня бягучага года, паказала, што ў вучэбных карпусах і інтэрнатах універсітэта ёсць істотныя недахопы ў падрыхтоўцы аб'ектаў да работы ў асенне-зімовы перыяд. Устаноўлена, што план мерапрыемстваў АГЧ ад 5 лістапада 1986 г., накіраваны на ўхіленне недахопаў, выяўленых народнымі дазорнымі восенню мінулага года, выконваецца ў большасці выпадкаў са значнай затрымкай устаноўленых тэрмінаў.

Пасля капітальнага рамонту першага паверха палепшылася вучэбная база ў корпусе № 1. Аднак у некаторых аўдыторыях другога і чацвёртага паверхаў адсутнічае ці разбіта шкло (№ 3-27, 3-23, 3-22, 3-21, 3-2, 4-12, 2-13, калідор трэцяга паверха і інш.). Асаблівую заклапочанасць выклікаюць паточныя аўдыторыі 3-1, 3-8, 4-3, у якіх неабходна абнавіць мэблю. У ауд. 3-8 не завершаны рамонт пасля ўстаноўкі тэлевізійнага абсталявання, а ауд. 2-23 патрабуе рамонту пасля знаходжання ў ёй маёмасці прыёмнай камісіі. У аўдыторыях і на паверхах вучэбнага корпуса не гараць каля 200(!) ляпм дзённага асвятлення. Не адрамантавана асвятленне актавай і спартыўнай залаў.

У вучэбным корпусе № 2 праведзен капітальны рамонт лекцыйнай ауд. 3-1, сістэмы ацяплення. Аднак па-ранейшаму знаходзяцца ў аварыйным стане столь чацвёртага паверха, аўдыторыі 3-10, 3-12, 4-12, а ў ауд. 4-9 са столі капае вада. У корпусе не хапае лямп дзённага асвятлення, недастаткова асветлены і паточныя аўдыторыі, лабараторыі. У асобных аўдыторыях, пакоях і на калідорах засталіся незашклёнымі вокны.

Зусім сумную карціну давялося ўбачыць у будынку вучэбнага корпуса № 3, які знаходзіцца ў аварыйным стане. Дах працякае, падлога хістаецца. Адным словам, ніякіх умоў для вучобы студэнтаў.

Не ўсё даведзена да ладу і ў галоўным корпусе. Ва ўсіх вучэбных аўдыторыях трэцяга і пятага паверхаў адсутнічае належнае асвятленне, няма шпінгалетаў на вокнах. У большасці аўдыторый не хапае стулляў, а сярод тых, што ёсць, нямала зламаных.

Калі няма належнага парадку ў аўдыторыях і карпусах, дык можа ён ёсць у інтэрнатах? — пацікавіліся кантралёры. Аднак, як стала бачна, не было яго і там. У інтэрнаце № 1, напрыклад, цячэ дах, таму ў асобных пакоях пятага паверха і на лесвічнай пляцоўцы — вільготныя сцены і столь. Ва ўмывальніках не хапае ракавін і кранаў. З-за няспраўнасці закрыты мужчынскі душ і туалеты.

Інтэрнат № 2 па вуліцы Кірава ў лепшым стане, чым першы. Тут адрамантавана 27 пакояў, праведзен таксама рамонт першага паверха будынка, сістэм водазабеспячэння і каналізацыі, аклеены вокны ў калідорах і службовых памяшканнях. Аднак затрымліваюцца і не закончаны работы па абліцоўцы кафляй дзвюх перагародак душа і насцілу падлогі лінолеумам.

У ходзе агляду агульнага стану інтэрната № 4 народнымі кантралёрамі ўстаноўлена, што ў калідорах і асобных пакоях разбіты шыбы ў вокнах. На асобных паверхах не працуе большасць электрапліт, у кухнях адсутнічала гарачая вада. У тых калідорах і пакоях, якія выходзяць на паўночны бок, недастатковая колькасць ацяпляльных батарэй і, відавочна, тут зімой будзе холадна. У вочы кідалася тое, што ў інтэрнаце шмат няспраўных лямп дзённага асвятлення, не хапае мэблі. Асобныя пакоі не адрамантаваны.

Пытанне аб гатоўнасці вучэбных карпусоў і інтэрнатаў універсітэта да работы ў асенне-зімовы перыяд бягучага навучальнага года былі абмеркаваны на партыйным сходзе АГЧ 5 кастрычніка. Вынікі праверак даведзены да ведама працоўнага калектыву.

На думку памочніка прарэктара АГР М. П. Шкарбуна, універсітэт да зімы рыхтуецца. Пытанне цеплазабеспячэння аб'ектаў універсітэта практычна вырашана. Галоўнаму энергетыку А. Т. Сувіжэнкаву і інжынеру па капітальнаму рамонту будынкаў А. С. Паплаўскаму неабходна прыняць тэрміновыя меры, каб ліквідаваць выяўленыя групай народнага кантролю недахопы ў падрыхтоўцы аб'ектаў універсітэта да зімы.

Партыйны сход намеціў мерапрыемствы для ўхілення недахопаў, прыняў пастанову павысіць адказнасць кіраўніцтва і галоўных спецыялістаў АГЧ, узмацніць кантроль за выкарыстаннем планавых тэрмінаў рамонтных і прафілактычных работ.

Цяпер важна, каб намечаныя рашэнні не разышліся з канкрэтнай справай. Зіма ж не чакае...

**Ю. ПРАЛЯСКОЎСКІ,**
**старшыня галаўной групы народнага кантролю ГДУ.**

*У студэнцкую бібліятэку*

## УЗЫХОДЖАННЕ ДА КУЛЬТУРЫ ПАЧУЦЦЯ КАХАННЯ

**Сярод навінак этычнай літаратуры бясспрэчную цікавасць выклікае зборнік афарызмаў і выслоўяў «Каханне. Шлюб. Сям'я» кандыдатаў філасофскіх навук Н. Я. Салаўёва і Т. П. Гаранінай, які выйшаў нядаўна ў выдавецтве «Университетское» (Мінск, 1987 г.).**

Тэма кахання — вечная. Яна пастаянна прыцягвае да сябе ўвагу не толькі філосафаў, пісьменнікаў, паэтаў, музыкантаў, псіхолагаў, але і кожнага чалавека. Сучасная цікавасць да гэтай тэмы надзвычай высокая менавіта таму, што фарміраванне пачуцця кахання суправаджаецца супярэчнасцямі, складанасцямі, вялікімі стратамі і расчараваннямі. Ва ўмовах дынамізму грамадскага жыцця, інтэнсіўнага развіцця НТР, павышэння ўзроўню матэрыяльнага дабрабыту і звязаных з ім спажывецкіх настрояў нярэдка сустракаюцца факты збяднення духоўных крыніц кахання, утылітарных адносін паміж людзьмі, эгаізму, безадказнасці.

Таму ўзнікае неабходнасць далучэння моладзі да духоўных скарбніц чалавецтва, у якіх захоўваецца глыбокая мудрасць, каштоўны вопыт перажыванняў, звязаных са здольнасцю да кахання і патрэбай кахаць.

У кнізе «Каханне. Шлюб. Сям'я» аўтары прасочваюць этапы ўзыходжання да культуры пачуцця кахання, своеасаблівую духоўна-псіхалагічную «тэхналогію» яго развіцця, захавання і ўмацавання. Мужчынская і жаночая годнасць — аснова ўзаемаразумення і згоды ў каханні, раўнавагі і роўнасці, павагі і чысціні адносін. Вялікая ўвага ўдзяляецца ў зборніку афарызмам, якія раскрываюць прыроду кахання, яго тайну і загадку, прыцягальную сілу, якая надае высакароднасць, насычанасць і багацце эмоцый.

Шмат карыснага і павучальнага зможа ўзяць моладзь з раздзелаў «Аб шлюбе», «Аб супярэчнасцях кахання і шлюбу», «Аб сям'і». Тут сабраны выказванні класікаў марксізма, выдатных мысліцеляў, мастакоў, якія разважаюць аб прынцыпах і нормах арганізацыі сумеснага жыцця, аб унутраных сувязях шлюбу і аслабляючых яго адмоўных уласцівасцях, аб радасцях і цяжкасцях сямейнага жыцця. З цікавасцю азнаёмяцца чытачы і з іншымі раздзеламі кнігі.

Зборнік афарызмаў і выслоўяў — добры дапаможнік, які можна выкарыстоўваць на занятках у народным універсітэце маральна-эстэтычнага выхавання студэнтаў: у клубе маладой сям'і, на факультэце сямейна-бытавой культуры. Матэрыялы кнігі таксама можна выкарыстаць у арганізацыі актыўных форм самастойнай вучэбнай работы студэнтаў, у працэсе чытання спецкурса «Актуальныя праблемы ўмацавання сям'і ў святле рашэнняў XXVII з'езда КПСС».

**Л. НЯДЗЕЛЯ,**
**загадчыца кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, дацэнт.**

**Ад рэдакцыі:** кнігу, аб якой расказвалася вышэй, вы можаце купіць у кнігарні № 19 (вул. Савецкая, 106).



**Першакурснікі універсітэта ўпэўнена ўваходзяць у студэнцкае жыццё. Лекцыі, практычныя, семінарскія заняткі паступова становяцца для іх прывычнымі, будзённымі. Паспелі з'явіцца і любімыя выкладчыкі, у якіх студэнт цэніць перш за ўсё выдатнае веданне прадмета, педагагічны такт і ўменне знаходзіць кантакт з аўдыторыяй. Да такіх адносіцца выкладчыца кафедры англійскай мовы Н. П. Марозава, якую вы бачыце на здымку. Яна вядзе заняткі па замежнай мове ў гр. Р-12 гісторыка-філалагічнага факультэта.**

Фота Л. Акінчыц.

## ПАЗНАЁМІЛІСЯ З НАВІНКАМІ

**На мінулым тыдні ўпершыню пасля летняга перапынку ў фае чытальнай залы галоўнага корпуса ГДУ працавала кніжна-ілюстрацыйная выстаўка новых паступленняў у бібліятэку ГДУ. На ёй шырока экспанавалася літаратура па многіх галінах ведаў. Усяго было прадстаўлена 411 назваў, сярод якіх — шмат літаратуры па фізіцы, матэматыцы, грамадскіх дысцыплінах. Многія выданні выклікалі вялікую цікавасць наведвальнікаў.**

**Такія выстаўкі не рэдкая з'ява, яны праводзяцца штомесячна. Бібліятэка запрашае ўсіх жадаючых наведваць інфармацыйныя выстаўкі навінак. Аб дні іх правядзення можна даведацца з аб'яў, якія вывешваюцца ва ўсіх вучэбных карпусах універсітэта.**

**Н. ГУРЭВІЧ,**
**загадчыца даведніцка-бібліяграфічнага аддзела бібліятэкі.**

*Археалагічныя раскопкі: незвычайны ракурс*

# ВУЧЫЦЦА САМАСТОЙНАСЦІ

Так ужо павялося: пісаць аб археалагічных раскопках — значыць гаварыць аб знаходках, аб старажытных рэчах. Вядома, што рэчы даўняга мінулага — гэта вельмі цікава. Але мы хацелі б адступіць ад традыцыі і напісаць пра тое, якую ролю адыгрывае на раскопках чалавечы фактар. Бо менавіта ад яго вельмі многае залежыць у рабоце археалагічнай экспедыцыі. Вопыт паказвае: самае галоўнае для поспеху справы — стварыць такую атмасферу, каб кожны студэнт (у даным выпадку размова ідзе пра студэнтаў-гісторыкаў першага курса гістфіла) адчуваў сябе не проста выканаўцам, а паўнапраўным удзельнікам раскопак.

І вось прыйшлі яны ў парк культуры і адпачынку імя Луначарскага. Першае, што ўбачылі на месцы будучых раскопак, іх яўна не ўзрадавала. Каля кінатэатра імя Ісачанкі толькі што знеслі будынак колішняй канюшні князёў Паскевічаў, у якім у апошні час размяшчаўся фальклорны тэатр «Жалейка». Усюды ляжалі кучы смецця. Іх убіралі бульдозеры і экскаватар, з пашкоджанай вадаправоднай трубы цякла вада. З яе ўжо ўтварылася вялікая лужына. «Ды ці можна тут штонебудзь знайсці?» — міжволі ўзнікла думка. Рукі студэнтаў маглі апусціцца яшчэ да пачатку раскопак. У такой абстаноўцы патрэбна было ўзняць дух, падбадзёрыць людзей, растлумачыць, паказаць перспектыву. І тут вельмі дарэчы прыйшліся расказы кіраўніка раскопак А. А. Макушнікава і загадчыка аддзела дарэвалюцыйнага перыяду абласнога краязнаўчага музея У. А. Літвінава пра раскопкі мінулага года, якія праводзіліся побач з тэатрам «Жалейка», пра тое, што было знойдзена тут, і што яшчэ можна адшукаць. А расказаць было пра што: знойдзена каля дзесяці тысяч розных рэчаў. Некалькі дзесяткаў самых выдатных з іх дэманструюцца на выстаўцы ў музеі. Кожны можа пабываць на ёй, убачыць знойдзенае сваімі вачамі, а той, хто ўдзельнічае ў раскопках, і сам мае шанц знайсці нешта падобнае і нават больш цікавае.

Раскопкі пачаліся. Неўзабаве сталі з'яўляцца і знаходкі, праўда, пакуль што не вельмі значныя — абломкі керамікі, радзей — кавалачкі шкляных бранзалетаў. Пазней пашанцавала знайсці і рэшткі старых пабудоў, і манеты, і пацеркі, і нажы. А пакуль што — зверху або пякучае сонца, або шэрыя хмары, а ўнізе — зямля, зямля ды цагляныя фундаменты канюшняў. Перакрыжаванні гэтых фундаментаў нагадваюць раму, крыху фантазіі — і можна сабе ўявіць, што гэта рама ад акна, якое дазваляе зазірнуць у мінулае. Тады становіцца цікавей працаваць. А колькі яе тут — зямлі! Яе трэба не толькі капаць, але і старанна перабіраць рукамі, каб не празяваць нават самую маленькую рэч. А потым патрэбна вынесці гэтую зямлю за межы раскопак на насілках. Што і казаць, праца цяжкая і даволі нудная, бо знаходкі трапляюцца не на кожным кроку. І працуюць не ўсе аднолькава. А хочацца, каб кожны працаваў з поўнай аддачай сіл. Як гэта зрабіць, улічваючы спецыфіку археалагічных раскопак? Спецыфіка тут ёсць. Яна заключаецца ў тым, што, з аднаго боку, зямлі патрэбна выбраць як мага больш, тады і знаходак больш адшукаеш. Але, з другога баку, патрэбна вельмі ўважліва перабраць кожную яе жменьку. Нездарма ж вядомы беларускі археолаг доктар гістарычных навук Г. В. Штыхаў (дарэчы, наш зямляк) любіць паўтараць на раскопках: «Хто капае вельмі хутка, той лянуецца!» Як жа быць? Як дасягнуць аптымальнага спалучэння колькасці з якасцю? Вось тут актывізаваць чалавечы фактар дапамагаюць самакіраванне і галоснасць. У стварэнні ўмоў для іх развіцця мы бачым адну з сваіх галоўных задач, як кіраўнікоў практыкі.

Вядома, студэнты павінны выконваць распараджэнні кіраўніцтва, але вельмі важна ўлічваць іх думку ў працэсе работы і пры падвядзенні яе вынікаў. Студэнты добра ведаюць сваіх таварышаў, іх характары, схільнасці, здольнасці і таму ў стане даць аб'ектыўную ацэнку стараннасці і добрасумленнасці кожнага. Вельмі добра, калі такая думка выказваецца ўслых. Вопыт паказвае, што вынікі працы лепш падводзіць штодзённа, а ў канцы практыкі мэтазгодна падвесці канчатковыя вынікі на агульным сходзе, дзе слова можа ўзяць кожны жадаючы.

Такім чынам, студэнты на справе вучацца самакіраванню, самастойнасці, што вельмі важна для далейшай іх вучобы ва універсітэце.

**У. БАГАМОЛЬНІКАЎ,**
**асістэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі;**
**В. СЫЧОЎ,**
**асістэнт кафедры гісторыі СССР і БССР.**

## ДЫЯЛОГ З ЧЫТАЧАМІ

адбыўся на мінулым тыдні ў актавай зале ГДУ. На сустрэчу са студэнтамі прыйшлі журналісты рэспубліканскай маладзёжнай газеты «Чырвоная змена» — намеснік рэдактара Анатоль Зэкаў, уласны карэспандэнт «Чырвонкі» па Гомельскай вобласці Анатоль Бароўскі, загадчыцы аддзелаў прапаганды і агітацыі, эканомікі Вольга Шаўко і Надзея Рошчына. Яны ставілі сваёй мэтай (а такія сустрэчы таксама адбыліся з працоўнай і студэнцкай моладдзю Гомельскага завода пускавых рухавікоў і Мазырскага педагагічнага інстытута) пачуць думку чытачоў газеты аб тым, што ім падабаецца чытаць на яе старонках, якія яшчэ не закранутыя журналістамі тэмы павінны знайсці ў газеце сваё асвятленне, выслухаць прапановы, крытычныя заўвагі, каб усё гэта ў канчатковым выніку садзейнічала павелічэнню колькасці падпісчыкаў газеты.

У газеты — слаўная і багатая гісторыя. Звыш шасці дзесяцігоддзяў «Чырвоная змена» з'яўляецца нязменнай спадарожніцай і дарадчыцай беларускай моладзі. На пярэднім краі яна і сёння — у час перабудовы нашага жыцця. Аб ролі і месцы беларускіх юнакоў і дзяўчат у вялікіх пераўтварэннях і расказваюць на старонках газеты работнікі рэдакцыі. Яны — у няспынным пошуку. А ён прыносіць большы плён, калі адбываецца жывы дыялог журналістаў і чытачоў.

